кую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлена стэла.

в. Вароны, цэнтр сельсавета

763. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). Каля шашы Віцебск — Смаленск. Пахаваны 3582 воіны і партызаны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных — воіны 158-й стралковай дывізіі 84-га стралковага корпуса 39-й арміі. У 1956 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура 2 воінаў, у 1964 г. ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі з імёнамі загінуўшых.

764. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, на беразе воз. Палонскае. 3 курганы вышынёй 3,5 м, дыяметрам 15 м. Выявіў і абследаваў у 1972 г. Г. В. Штыхаў, у 1981 г. абследаваў Л. У. Калядзінскі. Раскопкі не праводзіліся.

765. МЕСЦА БОЮ 1812 г. (гіст.). На паўднёвай ускраіне вёскі, непадалёку ад шашы Віцебск — Смаленск.

У кастрычніку 1812 г. рускія войскі корпуса П. Х. Вітгенштэйна вялі баі ў раёне Віцебска супраць французскіх захопнікаў. 26.10.1812 г. пасля кароткага бою напалеонаўскія войскі, падпаліўшы мост цераз Заходнюю Дзвіну, адступілі з Віцебска па Смаленскай дарозе. Пры дапамозе гараджан рускія салдаты патушылі агонь, перайшлі раку і пачалі праследаванне ворага. За 16 км ад горада каля в. Вароны атрад уланаў пад камандаваннем падпалкоўніка Сталышіна дагнаў французаў і ўступіў з імі ў



765. *Помнік на месцы бою 1812 г.*



766. *Помнік землякам.*

бой. Варожы ар'ергард быў разбіты, каля 400 салдат, некалькі афіцэраў і генерал узяты ў палон. Былі захоплены 2 гарматы і шмат вайсковага рыштунку.

У 1912 г. на сродкі вайсковай часці ямбургскіх уланаў на месцы бою пастаўлены помнік — абеліск з літым чыгунным крыжам.

Літ.: Добровольский В. К. Витебская губерния в Отечественную войну.— Витебск, 1912; Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г.— Мн., 1962. *М. К. Кошалеў.*

766. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 167 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. насыпаны Курган.

767. ПОМНІК САВЕЦКІМ ЛЁТЧЫКАМ (гіст.). За 1,5 км на захад ад вёскі, каля шашы Лёзна — Віцебск.

953-і штурмавы авіяполк быў сфарміраваны ў жніўні 1942 г., уваходзіў у склад 1-й Паветранай арміі. 16.10.1943 г. авіяполк прыбыў на франтавы аэрадром на захад ад Смаленска, адкуль рабіў баявыя вылеты ў раён Оршы. Вызначыўся ў баях за вызваленне Віцебска і вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Атрымаў ганаровае найменне «Віцебскі». Пазней авіяполк удзельнічаў у вызваленні Мінска, Вільнюса, Кёнігсберга, Польшчы і інш. Узнагароджаны ордэнамі Суворава і Кутузава.

У 1980 г. на ўшанаванне памяці лётчыкаў авіяпалка пастаўлены 2 стылізаваныя пілоны.

в. Васькавічы, Заронаўскі сельсавет

768. РАДЗІМА АНТОНЕНКІ Аляксея Касьянавіча (гіст.).

Герой Савецкага Саюза А. К. Антоненка нарадзіўся 29.1.1911 г. ў сям'і чыгуначніка. Член КПСС. Пасля заканчэння школы ФЗН працаваў слесарам і памочнікам машыніста паравоза. З 1929 г. ў Чырвонай Арміі, скончыў Ейскае ваенна-марское авіяцыйнае вучылішча (1932 г.). Удзельнік баёў на Хал-Хін-Голе, савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г., лётчык-знішчальнік. 23.6.1941 г. ў паветраным баі пад Талінам збіў «юнкерс». Абараняў Ленінград, збіў 4 самалёты. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 14.7.1941 г. Загінуў у баі 26.7.1941 г. Пахаваны ў Фінляндыі на паўвостраве Ханка. Яго імем названы вуліца ў Ленінградзе, пасёлак у Ленінградскай вобл. Навечна занесены ў спісы знішчальнага авіяпалка.

Літ.: Навечно в сердце народном.— 3 изд.— Мн., 1984. *В. Б. Караткевіч.*


в. Ваўчкі (не існуе), Вымнянскі сельсавет

769. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Ваўчкі знаходзілася за 1,5 км на паўночны захад ад в. Фокіна. У лютым 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі вёску разам з жыхарамі (43 чалавекі). Пасля вайны не адрадзілася. У 1968 г. на месцы былой вёскі насыпаны Курган.

в. Ваяводкі, Ноўкінскі сельсавет

770. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі, каля школы. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў чэрвені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза Аляксандр Пятровіч Жасткоў.

А. П. Жасткоў нарадзіўся 26.7.1922 г. ў в. Слаўцава Меленкаўскага р-на Уладзімірскай вобл. Чл. КПСС з 1944 г. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў на Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. Камандаваў кулямётным узводам 279-га гвардзейскага стралковага палка 91-й гвардзейскай стралковай Духаўшчынскай дывізіі. Гвардыі лейтэнант А. П. Жасткоў вызначыўся ў час Віцебска-Аршанскай аперацыі. 23.6.1944 г. ў час прарыву абароны ворага ўзвод у раёне в. Карпавічы падавіў 6 агнявых кропак і знішчыў каля 100 гітлераўцаў. Праследуючы праціўніка, фарсіраваў р. Лучосу і ўмацаваўся на яе



767. *Помнік савецкім лётчыкам.*